Песню бярыце з сабою...

Рубрыку вядзе кампазітар Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com



# ЗАШАЛЯСЦЕЛА...

**Пятро Глебка (1905—1969) — беларускі савецкі паэт, драматург, перакладчык, акадэмік АН БССР, народны паэт БССР. Аўтар шматлікіх паэм, зборнікаў дзіцячай і дарослай паэзіі, драматычных твораў, кніг на рысаў, перакладаў на рускую мову. Узнагароджаны шматлікімі ордэнамі (Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны»).**

**Нарадзіўся ў в. Вялікая Уса на Уздзеншчыне. У часы навучання ў Беларускім педтэхнікуме П. Глебка блізка сышоўся з П. Трусам і М. Лужаніным. Гэтае сяброўства пісьменнікі пранеслі праз усё жыццё. Падчас Вялікай Айчыннай вайны працаваў у рэдакцыях франтавых газет, друкаваў вершы і куплеты ў сатырычных выданнях. Адметнымі рысамі творчасці пісьменніка сталі публіцыстычнасць, душэўны лірызм, усхваляванасць.**

**Вершы — Пятро ГЛЕБКА,**
**музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**

*1.* *Клён завяў ды стаіць*
*у раздум'і,*
*Галаву апусціўшы на дол:*
*Паляцелі лісты, быццам*
*думы,*
*Паляцелі зямлі на прыпол.*
***Прыпеў:***
*Зашалясцела ў цёмным лісці*
*клёнаў,*
*Зашалясцела звонам*
*серабра...*
*І з ветлаю падзякаю-*
*паклонам*
*Схілілася над рэчкаю вярба.*
*2. Я і сам прыціхаю*
*пад клёнам:*
*Паляцець залатым бы*
*лісцём*
*Ды упасці далёка...*
*з паклонам*
*Перад новай красой*
*і жыццём.*
***Прыпеў:***
*3. Я іду, а лісты адлятаюць;*
*І чамусьці хмурнее*
*мой твар:*
*Быццам сэрца аддаў*
*развітанню —*
*У няведамым шмат*
*хараства.*
***Прыпеў.***




Сакрэт поспеху

## СТАЎ СТУДЭНТАМ? ПАХВАЛІСЯ...

**Стартаваў анлайн-конкурс для першакурснікаў «Як я паступіў у БДУ».**

Пляцоўкай для яго правядзення сталі сацыяльныя сеткі ўніверсітэта. Сярод іх «УКантакце», Instagram і Facebook.

Да ўдзелу запрашаюцца студэнты першых курсаў усіх факультэтаў БДУ. Хлопцам і дзяўчатам прапануецца распавесці, чаму яны выбралі БДУ і як прайшло іх паступленне.

Творчыя работы могуць быць выкананы ў фармаце відэааповеду або тэксту з фотаздымкамі. Матэрыялы неабходна размясціць у любой з сацыяльных сетак з хэштэгам #япоступілвБГУ і адзначыць афіцыйны акаўнт БДУ. Таксама неабходна падпісацца на Telegram-канал і акаўнт БДУ ў той сацыяльнай сетцы, дзе размешчаны пост.

Аб'ём тэксту не павінен перавышаць адну старонку А4, а відэа — не больш чым адну хвіліну.

Падзяліцца сваёй гісторыяй неабходна да 30 жніўня. Па выніку анлайн-конкурсу 31 жніўня вызначаць трох пераможцаў. Яны атрымаюць памятныя прызы.

Арганізатарам конкурсу выступае Цэнтр карпаратыўных камунікацый БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.09 | 20.12 | 14.03 |
| Віцебск — | 5.52 | 20.09 | 14.17 |
| Магілёў — | 5.59 | 20.02 | 14.03 |
| Гомель — | 5.59 | 19.55 | 13.56 |
| Гродна — | 6.25 | 20.35 | 14.10 |
| Брэст — | 6.29 | 20.23 | 13.54 |

## Месяц

***Поўня 22 жніўня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

## Імяніны

***Пр.** Евы, Еўдакіі, Аляксея, Аркадзя, Мікалая, Уладзіміра, Фёдара, Фядоса.*
***К.** Монікі, Тодара, Цэзара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты Падзеі Людзі

### 27 ЖНІЎНЯ




**1860** год — нарадзіўся (в. Станькава, цяпер у Дзяржынскім раёне) Караль Эмерыкавіч Чапскі, адзін з прадстаўнікоў старажытнага роду Гутэн-Чапскіх. У 1882 г. скончыў Дэрпцкі (Тартускі) універсітэт. У 1890—1901 гадах гарадскі галава ў Мінску. Узначальваў многія грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі. Адкрыў у Мінску прытулак, шпіталь, амбулаторыю, запусціў электрастанцыю, трамвай, забрукаваў многія вуліцы. Са дзейнічаў адкрыццю ў Мінску Таварыства аматараў спорту (з 1892 года яго старшыня), Таварыства аховы жанчын, гарадскога крэдытнага таварыства. Быў актыўным членам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Пабудаваў піўзавод «Багемія», прададзены пасля сям'і Лекертаў.



**1906** год — нарадзіўся (в. Лявонавічы, цяпер у Нясвіжскім раёне) Сяргей Новік-Пяюн, беларускі пісьменнік. Скончыў Нясвіжскую гімназію і беларускія настаўніцкія курсы ў Вільні. Арганізатар і кіраўнік у родпай вёсцы беларускага народнага хору, тэатра, гуртка Таварыства беларускай школы, бібліятэкі. Працаваў у Слоніме інспектарам аддзела народнай адукацыі, дырэктарам краязнаўчага музея. Аўтар паэтычных зборнікаў «Заўсёды з песняй», «Зорачкі ясныя», успамінаў пра Я. Купалу, І. Стаброўскага, Я. Карскага. Напісаў больш за 100 песень, некаторыя з іх сталі народнымі.




**1871** год — нарадзіўся Тэадор Драйзер, амерыканскі пісьменнік, публіцыст. Аўтар раманаў «Сястра Кэры», «Джэні Герхард», «Тытан», «Стоік» і іншага.

**1896** год — нарадзілася Фаіна Георгіеўна Ранеўская, руская савецкая актрыса тэатра і кіно, народная артыстка СССР. З 1931 г. працавала ў маскоўскіх тэатрах — Цэнтральным тэатры Чырвонай Арміі, імя Маякоўскага, імя Пушкіна, імя Масавета. Здымалася ў кіно: «Пампушка», «Падкідыш», «Мара» і многіх іншых. Неаднаразовы лаўрэат Сталінскай прэміі.

**1919** год — Саўнаркам прыняў дэкрэт аб нацыяналізацыі ўсёй кіна- і фотапрамысловасці РСФСР. З 1979 года гэтая дата адзначалася як Дзень савецкага кіно.

**1940** год — у Нью-Ёрку была прадэманстравана першая сістэма каляровага тэлебачання, прыдатная для практычнага прымянення, аўтарам якой быў венгерскі эмігрант Пітэр Карл Голдмарк. Першая ідэя эфірнай перадачы каляровых малюнкаў належала рускаму інжынеру Аванесу Адамяну, якую ён сфармуляваў яшчэ ў 1907—1908 гадах. У 1925 годзе ім ужо была распрацавана сістэма трохколернага тэлебачання, тэхнічна рэалізаваная шатландскім вынаходнікам Дж. Бэрдам у 1928 годзе.




**ЛАФАНТЭН:**

*«На крылах часу адлятае смутак».*




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2182.

Нумар падпісаны ў 19.30 26 жніўня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12